# БЕЛАРУСЬ

Свабода веравызнання абвешчана канстытуцыяй, але на практыцы ўлады абмяжоўвалі гэтае права.

Урад па-ранейшаму абмяжоўваў свабоду веравызнання ў адпаведнасці з палажэннямі прынятага ў 2002 годзе закона аб веравызнанні і падпісанага ў 2003 годзе пагаднення з Беларускай Праваслаўнай Царквой (БПЦ), што ёсць часткай Рускай Праваслаўнай Царквы (РПЦ) і адзінай афіцыйна прызнанай у краіне праваслаўнай царквой. Нягледзячы на тое, што ў краіне няма дзяржаўнай рэлігіі, пагадненне надае БПЦ прывілеяваны статус. Адмоўнае стаўленне да пратэстантаў было асабліва выразным. Улады вымушалі многія рэлігійныя суполкі чакаць на працягу некалькіх гадоў рашэнняў, што тычыліся рэстытуцыі ці рэгістрацыі ўласнасці. Улады праследавалі і штрафавалі сябраў некаторых рэлігійных груп, асабліва тых, што расцэньваліся як праваднікі іншаземнага культурнага ўплыву або як палітычна заангажаваныя. Урад ствараў перашкоды для замежных місіянераў, святарства і гуманітарных работнікаў, звязаных з цэрквамі: дэпартаваў, адмаўляў у візах і ануляваў выдадзеныя візы. За справаздачны перыяд вырас узровень абмежаванняў, што тычацца святароў з-за мяжы.

Рэакцыя ўрада на шматлікія антысеміцкія дзеянні і захады супраць рэлігійных помнікаў, будынкаў і могілак была малазаўважнай.

Некаторыя прадстаўнікі грамадства канструктыўна працавалі на карысць свабоды веравызнання, але былі выпадкі дыскрымінацыі і пераследу з боку грамадства, напрыклад, шматлікія акты вандалізму і падпалы культавых месцаў, будынкаў і помнікаў.

Урад Злучаных Штатаў Амерыкі ўздымае пытанні свабоды веравызнання ў размовах з урадам у межах сваёй агульнай палітыкі, скіраванай на абарону правоў чалавека.

Частка 1. Рэлігійная дэмаграфія

Тэрыторыя краіны -- 80154 квадратныя мілі, насельніцтва – 9,7 мільёна. На працягу сваёй гісторыі краіна была арэнай як узаемадзеяння, так і супрацьстаяння паміж беларускім праваслаўем і рыма-каталіцызмам. Цягам справаздачнага перыяду адносіны між гэтымі канфесіямі палепшыліся. Напрыклад, у чэрвені 2008 года Дзяржаўны сакратар Ватыкана кардынал Бэртонэ сустрэўся з мітрапалітам Філарэтам як прадстаўніком Рускай Праваслаўнай Царквы і адзначыў паляпшэнні ў адносінах паміж цэрквамі, а таксама больш высокі ўзровень супрацоўніцтва.

Паводле дадзеных за 2007 год, што паступілі з Апарата ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў (АУСРН), каля 50 адсоткаў беларусаў лічаць сябе вернікамі, а сярод іх прыкладна 80 адсоткаў адносяцца да БПЦ, 14 адсоткаў прылічаюць сябе да рымска-каталіцкай царквы, 4 адсоткі адносяць сябе да ўсходніх рэлігійных груп (у тым ліку мусульман , крышнаітаў, бахаяў), а пратэстанты, у тым ліку адвентысты сёмага дня,

стараверы, Сведкі Іеговы, хрысціяне веры апостальскай і лютэране складаюць 2 адсоткі. З тых, хто вызначае сябе як праваслаўны ці рыма-каталік, толькі 18 і 50 адсоткаў адпаведна рэгулярна наведваюць набажэнствы. Ёсць таксама вызнаўцы грэка-каталіцызму і прыхільнікі праваслаўных суполак, што не належаць да БПЦ. Паводле яўрэйскіх суполак, ад 50 да 70 тысяч чалавек лічаць сябе яўрэямі. Большасць прадстаўнікоў яўрэйскага насельніцтва не вызнавалі рэлігію актыўна.

Паводле дадзеных АУСРН студзень 2007 года, у краіне існавала 3103 рэлігійных арганізацыі 25 рэлігійных канфесій і дэнамінацый, у тым ліку 2953 зарэгістраваных рэлігійных супольнасцяў, 150 рэспубліканскіх і канфесійных аб'яднанняў (кляштараў, братэрстваў, груп місіянераў і г.д.). Сюды ўвайшлі 1399 прыходаў Беларускай Праваслаўнай Царквы, 493 прыходы евангельскіх хрысціян, 440 рымска-каталіцкіх, 267 прыходаў евангельскіх хрысціян-баптыстаў, 74 прыходы адвентыстаў сёмага дня, 54 прыходы хрысціян Поўнага Евангелля, 33 стараверскіх, 29 іудзейскіх, 27 лютэранскіх, 26 прыходаў Сведкаў Іеговы, 24 мусульманскіх, 21 прыход нова-апостальскай царквы, 17 прыходаў прагрэсіўных іудзеяў, 13 грэка-каталіцкіх, 9 прыходаў хрысціян веры апостальскай, 6 крышнаіцкіх і 5 бахайскіх, 5 прыходаў Царквы Хрыста, 4 прыходы Царквы Ісуса Хрыста і Святых Апошніх Дзён (мармонскіх), 2 месіянскіх, 1 прыход рэфармісцкай царквы, 1 прыход прэсвітэран, 1 армянскі апостальскі, адзін лацінска-каталіцкі і адзін прыход Іаганскай царквы.

## Частка 2. Становішча са свабодай веравызнання

### Прававыя і палітычныя ўмовы

Свабода веравызнання абвешчана канстытуцыяй, але на практыцы дзяржава абмяжоўвала гэтае права. Нягледзячы на тое, што канстытуцыя, прынятая з папраўкамі ў 1996 годзе, сцвярджае роўнасць усіх рэлігій і дэнамінацый перад законам, яна ўтрымлівае абмежавальную агаворку пра тое, што адносіны паміж дзяржавай і рэлігійнымі арганізацыямі "рэгулююцца з улікам іх уплыву на фармаванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа". Рэгуляваннем усіх рэлігійных пытанняў займаецца АУСРН.

Насуперак пратэстам праваабарончых арганізацый, Еўрапейскага Саюза і мясцовых рэлігійных груп, у 2002 годзе прэзідэнт Лукашэнка падпісаў закон аб веравызнанні, які сцвярджае вызначальную ролю праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа, а таксама гістарычнае значэнне каталіцызму, іудаізму, ісламу і евангелічна-лютэранскай царквы – груп, што прытрымліваюцца так званых "традыцыйных вераванняў". Аднак паняцце "традыцыйныя вераванні", што ўзгадваецца ў законе, не распаўсюджанае на рэлігійныя групы з глыбокімі гістарычнымі каранямі ў краіне, напрыклад, беспапоўскія стараверскія і кальвінісцкія суполкі, што з'явіліся ў краіне ўжо ў 17 стагоддзі.

Нягледзячы на тое, што закон дэкларуе свабоду веравызнання, ён утрымлівае шэраг абмежавальных палажэнняў, што павышаюць узровень кантролю ўрада. Закон патрабуе, каб усе рэлігійныя групы атрымлівалі дазвол урада на ўвоз і распаўсюд рэлігійнай

літаратуры, забараняе замежнікам узначальваць рэлігійныя арганізацыі і пазбаўляе рэлігійныя суполкі права ствараць навучальныя ўстановы для падрыхтоўкі святароў.

У дадатак, закон абмяжоўвае дзейнасць рэлігійных суполак тымі раёнамі, дзе яны зарэгістраваныя, і ўводзіць складаныя рэгістрацыйныя патрабаванні, якія цяжка выканаць многім як традыцыйным, так і нетрадыцыйным рэлігійным суполкам. Закон запатрабаваў таксама, каб усе зарэгістраваныя раней рэлігійныя групы прайшлі да 2004 года перарэгістрацыю, і забараніў любую рэлігійную дзейнасць незарэгістраваных рэлігійных груп.

Закон аб веравызнанні вызначае трохузроўневую структуру рэлігійных арганізацый: рэлігійныя суполкі, рэлігійныя аб'яднанні і рэспубліканскія рэлігійныя аб'яднанні. Рэлігійныя суполкі ці мясцовыя рэлігійныя арганізацыі-адзінкі павінны налічваць не менш як дваццаць сябраў ва ўзросце не маладзей за 18 гадоў, што жывуць у дадзенай мясцовасці. Рэлігійныя аб'яднанні павінны мець не менш як 10 суполак, прычым адна з іх павінна дзейнічаць у краіне па меншай меры 20 гадоў, і могуць быць заснаваныя толькі рэспубліканскімі рэлігійнымі аб'яднаннямі (на агульнанацыянальным узроўні). Рэспубліканскія рэлігійныя аб'яднанні ствараюцца толькі ў тым выпадку, калі актыўныя рэлігійныя суполкі ёсць у бальшыні з 6 абласцей краіны.

Рэлігійная суполка павінна прадаставіць спіс імёнаў заснавальнікаў, іх адрасы, інфармацыю аб грамадзянстве і асабістыя подпісы, а таксама копіі ўстаноўчага статута, пратакол устаноўчага сходу аб'яднання і дазвол ад мясцовых уладаў, што пацвярджаў бы права на размяшчэнне ў пэўным месцы і выкарыстанне любой маёмасці, узгаданай ва ўстаноўчых дакументах. Заявы на рэгістрацыю разглядаюцца абласнымі выканаўчымі камітэтамі (для суполак за межамі Мінска) і Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам. Суполка, якая вызнае рэлігію, што раней не была "вядомая" ўраду, павінна таксама падаць інфармацыю пра сваю рэлігію. За справаздачны перыяд ніводную рэлігійную суполку, што не была раней "вядомая", не зарэгістравалі.

Рэлігійнае аб'яднанне павінна падаць спіс сяброў свайго кіруючага органа з біяграфічнымі звесткамі, дакумент, што пацвярджае права аб'яднання на размяшчэнне ў пэўным месцы, і пратаколы ўстаноўчага сходу аб'яднання. Аб'яднанні валодаюць выключным правам ствараць духоўныя навучальныя ўстановы, запрашаць замежных грамадзян для працы з рэлігійнымі групамі і ствараць кляштары і манаскія суполкі.

Усе заяўкі на заснаванне аб'яднанняў і рэспубліканскіх аб'яднанняў неабходна падаваць у АУСРН. У 2007 годзе ўрад зарэгістраваў пяць рэспубліканскіх рэлігійных аб'яднанняў. Паводле хрысціянскіх суполак, закон жорстка абмяжоўвае іх дзейнасць, пазбаўляе свабоды веравызнання і легалізуе крымінальны пераслед асобаў за рэлігійныя перакананні.

На працягу справаздачнага перыяду лідэры рэлігійных суполак распаўсюджвалі петыцыю, што заклікала ўрад да ўнясення зменаў у закон аб веравызнанні ад 2002 года. Петыцыя да ўладаў утрымлівала разам з іншымі заклікі да адмены рэгістрацыйных патрабаванняў, тэрытарыяльных межаў дзейнасці рэгілійных суполак і абмежаванняў, што тычацца працы

святароў з-за мяжы. Сярод падпісантаў былі не толькі вернікі, але і тыя, хто не вызначалі сябе як вернікаў, аднак выказвалі занепакоенасць наступствамі закона для сітуацыі са свабодамі выказвання і асацыяцый. Ініцыятары петыцыі сабралі 50 000 подпісаў у перыяд з 22 красавіка 2007 года да 28 лютага 2008 года і падалі петыцыю ў парламент і адміністрацыю прэзідэнта. 28 траўня 2007 года Беларускі экзархат БПЦ заклікаў вернікаў не падпісваць петыцыю і абвясціў, што закон дапамагае падтрымліваць мірнае суіснаванне рэлігійных груп і стабільнасць у краіне.

Падчас збору подпісаў пад петыцыяй удзельнікаў кампаніі арыштоўвалі і падвяргалі судоваму пераследу. 2 ліпеня 2007 года ў Будславе (Мядзельскі раён, Мінская вобласць) чатырнаццаць удзельнікаў кампаніі былі арыштаваныя падчас збору подпісаў пад петыцыяй на рымска-каталіцкім фэсце. 4 ліпеня 2007 года ў Мінску падчасператрусу ў прыватнай кватэры міліцыя арыштавала шасцярых пратэстантаў-удзельнікаў кампаніі. Паводле сведкі, міліцыя канфіскавала пратэстанцкія выданні і пяць экзэмпляраў улёткі, што тычылася кампаніі. Царква “Новае Жыццё”, пратэстанцкая суполка, што дзейнічае ў Мінску, таксама пацярпела за сваю кіраўнічую ролю ў кампаніі: па стане на люты 2008 года будынак царквы быў адключаны ад усіх камунальных паслуг, семярых прыхажан звольнілі з працы, як паведамлялася, на загад уладаў. 25 сакавіка 2008 года ў Мінску Генеральная пракуратура высунула супраць пастара царквы “Новае Жыццё” Вечаслава Ганчарэнкі абвінавачанне ў адміністратыўным парушэнні, звязаным з арганізацыяй кампаніі збору подпісаў. Падобнае абвінавачанне было высунутае 21 сакавіка супраць юрыста царквы “Новае Жыццё” Сяргея Луканіна. 22 красавіка 2008 года сустаршыню хрысціянскіх дэмакратаў Паўла Севярынца аштрафавалі на 650 долараў (1,4 мільёна рублёў) за яго працу падчас кампаніі збору подпісаў.

2 сакавіка 2008 года Канстытуцыйны Суд не задаволіў петыцыю, што заклікала да ўнясення зменаў у закон аб веравызнанні ад 2002 года, на той падставе, што разгляд пытання пра адпаведнасць закона канстытуцыі могуць ініцыяваць толькі кіраўнік дзяржавы і іншыя ўрадавыя службоўцы. Парламенцкія і прэзідэнцкія структуры таксама адказалі адмовай на петыцыю ў хуткім часе пасля яе атрымання, абвясціўшы, што ў краіне няма парушэнняў свабоды веравызнання.

Пагадненне, заключанае ў 2003 годзе паміж БПЦ і ўрадам, гарантуе БПЦ самастойнасць у яе ўнутраных справах і свабоду ў правядзенні рэлігійных абрадаў і іншай дзейнасці, а таксама асаблівыя адносіны з дзяржавай. Пагадненне прызнае за БПЦ ролю “у фармаванні духоўных, культурных і нацыянальных традыцый беларускага народа”. Яно заклікае ўрад і БПЦ да супрацоўніцтва пры правядзенні сваёй палітыкі ў розных сферах, у тым ліку ў сферах адукацыі, развіцця і аховы культурнай спадчыны, а таксама ў сферы бяспекі. Хоць у дакуменце і сцвярджаецца, што пагадненне не абмяжоўвае рэлігійныя свабоды іншых канфесій, яно заклікае ўрад і БПЦ змагацца супраць неназваных “псеўдарэлігійных структур, якія ўяўляюць небяспеку для асобы і грамадства”. У дадатак, БПЦ валодае эксклюзіўным правам выкарыстоўваць слова “праваслаўны” ў сваёй назве, а таксама выкарыстоўваць у якасці свайго сімвала выяву крыжа Ефрасінні, святой-апякункі краіны.

11 ліпеня 2007 года БПЦ падпісала з Міністэрствам адукацыі праграму супрацоўніцтва на перыяд з 2007 па 2010 год. Паводле слоў міністра адукацыі Радзькова, гэты дакумент

прадугледжвае супрацоўніцтва ў сферы духоўнага і маральнага выхавання дзяцей і моладзі. Мітрапаліт БПЦ Філарэт сказаў, што адукацыю і рэлігію больш не разглядаюць асобна, што маладых людзей трэба выхоўваць у адпаведнасці з высокімі духоўнымі ідэаламі, і што забяспечыць такое выхаванне - задача Царквы, сям'і і школы.

У 2006 годзе на праекты БПЦ урад выдзеліў 3 мільёны даляраў (6,4 мільярдаў рублёў).

Абмежаванні свабоды веравызнання

Улады абмяжоўвалі свабоду веравызнання як непасрэдна, так і ўскосна. Урад прымяняў законы, што абмяжоўваюць свабоду набажэнстваў, слова і сходаў; дзяржаўную рэгістрацыю неабходна атрымаць да пачатку рэлігійнай дзейнасці. Часам урад быў адказны за дзеянні, звязаныя з рэлігійнай нячуласцю і нецярпімасцю, і рэгулярна не выступаў з асуджэннем такіх дзеянняў. Урад часта называў "нетрадыцыйнымі" суполкі, што не лічыў традыцыйнымі, і шырока выкарыстоўваў тэрмін "секта" ў датычэнні да такіх суполак, хоць гэтае вызначэнне і не ёсць афіцыйным. Урад часцей ствараў перашкоды для замежных місіянераў, клерыкаў і гуманітарных работнікаў, у тым ліку дэпартаваў іх, адмаўляў ім у візах іануляваў выдадзеныя візы.

Многія "традыцыйныя" і "нетрадыцыйныя" рэлігійныя групы па-ранейшаму сутыкаліся са складанасцямі ў вырашэнні пытанняў арэнды, набыцця нерухомай маёмасці, а таксама рэгістрацыі маёмасці для абсталявання месцаў для набажэнства, а таксама пабудовы цэркваў ці вяртання сабе царкоўнай уласнасці, што знаходзіцца пад кантролем дзяржавы. Суполкі таксама сутыкаліся з праблемамі пры перааформленні нерухомай маёмасці з жылога фонду для яе выкарыстання як культавай; жыллёвы кодэкс дазваляе выкарыстоўваць такую маёмасць для нежыллёвых мэтаў толькі пасля атрымання дазволу мясцовых выканаўчых і адміністратыўных органаў. У выніку некалькі пратэстанцкіх цэркваў і "нетрадыцыйных" груп апынуліся ў тупіку: ім не даюць дазвол на выключэнне сваёй уласнасці з жылога фонду для выкарыстання яе ў рэлігійных мэтах таму, што яны не ёсць зарэгістраванымі рэлігійнымі групамі, і яны не могуць прайсці рэгістрацыю, не маючы юрыдычнага адраса. Такія групы часта вымушаны былі збірацца, парушаючы гэтыя патрабаванні, або сустракацца ў дамах сваіх прыхажан.

Пастанова ўрада прадугледжвае канкрэтныя меры па забеспячэнні грамадскага парадку і бяспекі пры правядзенні масавых грамадскіх мерапрыемстваў. Адміністрацыі некаторых грамадскіх аб'ектаў нерухомасці, спасылаючыся на гэтую пастанову, скасавалі ці адмовіліся падоўжыць дамовы з рэлігійнымі групамі на выкарыстанне сваіх памяшканняў. На працягу справаздачнага перыяду рэлігійным групам, асабліва незарэгістраваным, па-ранейшаму было складана арэндаваць грамадскае памяшканне. Найбольш ад гэтай пастановы цярпелі пратэстанцкія суполкі, таму што ў іх менш уласных памяшканняў, і ім даводзілася арэндаваць грамадскія памяшканні, калі колькасць сяброў занадта вялікая, каб сутракацца ў прыватных дамах.

Урад часта абмяжоўваў права на мірныя сходы, звязаныя з рэлігійнай дзейнасцю.

Паступалі вартыя даверу звесткі пра тое, што мясцовыя ўлады і настаўнікі спрабавалі высветліць, хто з дзяцей наведвае баптысцкую нядзельную школу. Паводле няўрадавай арганізацыі “Форум-18”, баптысцкі пастар Генадзь Бруцкі паведаміў, што тым дзецям, чыё наведванне баптысцкай нядзельнай школы было ўстаноўлена, пагражаў завуч. Таксама, па словах Сяргея Яску, пастара царквы евангельскіх хрысціян-баптыстаў “Вефіль”, дзяржаўны ідэолаг Бобрык запатрабаваў, каб настаўнікі высветлілі, ці наведваюць іх вучні пратэстанцкую нядзельную школу. Калі дзеці наведваюць такую школу, настаўнікі мелі “правесці размову” з іх бацькамі.

На працягу перыяду, ахопленага дадзенай справаздачай, урад сачыў за дзейнасцю суполак мірных рэлігійных суполак, асабліва тых, што успрымаў як “іншаземныя” або як “культы”. Паводле вартых даверу крыніц, прадстаўнікі службаў дзяржаўнай бяспекі часта наведвалі пратэстанцкія набажэнствы, каб весці назіранне.

Урад абмяжоўваў дзейнасць замежных святароў больш, чым на працягу ранейшых справаздачных перыядаў. 30 студзеня 2008 года ўрад увёў у дзеянне новыя палажэнні, што тычацца замежных святароў. Звяртацца ў АУСРН па дазвол на запрашэнне замежнага святара маюць права толькі зарэгістраваныя рэспубліканскія рэлігійныя аб’яднанні, і атрыманне дазволу неабходнае для таго, каб рэлігійныя дзеячы з-за мяжы мелі права пачынаць весці службы ў мясцовых прыходах, выкладаць ці вучыцца ў мясцовых установах, прымаць удзел у дабрачыннай дзейнасці і займацца пашырэннем замежных кантактаў рэлігійных суполак. АУСРН мае права не выдаваць такія дазволы і не даваць пры гэтым тлумачэнняў.

Меркавалася, што гэтыя палажэнні закрануць у першую чаргу рымска-каталіцкую і пратэстанцкія дэнамінацыі, прывядуць да змяншэння колькасці рымска-каталіцкіх святароў у краіне і абмяжуюць гуманітарныя і дабрачынныя праекты заходніх пратэстанцкіх цэркваў. Гэтае новае абмежаванне, што тычыцца замежных святароў, ёсць больш жорсткім, чым закон аб веравызнанні ад 2002 года, які дазваляў рэлігійным аб’яднанням запрашаць замежных грамадзян для рэлігійнай дзейнасці.

Як і на працягу ранейшых справаздачных перыядаў, атрыманню дазволу на наведванне краіны замежнымі рэлігійнымі дзеячамі часта папярэднічалі працяглыя бюракратычныя працэдуры. Закон патрабуе, каб замежныя місіянеры і клерыкі атрымлівалі гадавыя візы на шматразовы ўезд з дазволам займацца “рэлігійнай дзейнасцю”. Арганізацыя, што запрашае прадстаўніка кліру з-за мяжы, павінна падаць пісьмовую заяву ў АУСРН з пазначэннем тэрміну і мэты візіта. Нават калі візіт мае нерэлігійныя мэты (напрыклад, дабрачынныя), наведвальнікі павінны атрымаць візу і дазвол АУСРН. АУСРН дае адказ на працягу тэрміну да 20 дзён. Не існуе механізму, які дазваляў бы абскардзіць яго рашэнне.

Назіральнікі выказвалі занепакоенасць у сувязі з тым, што адсутнасць адзінай сістэмы ўрадавых патрабаванняў да выканання зьмененых у лютым 2006 года візавых працэдур уплывае на магчымасці для місіянераў жыць і працаваць у краіне. Улады часта распытвалі замежных місіянераў і гуманітарных работнікаў, а таксама мясцовых грамадзян, што працуюць з імі, пра крыніцы і выкарыстанне іх фінансавых сродкаў. Паступалі вартыя

даверу звесткі пра тое, што службы бяспекі сачылі і вялі назіранне за гэтымі замежнымі грамадзянамі.

23 снежня 2007 года Гжэгаж Худэк, рымска-каталіцкі святар, які служыў у Рэчыцы Гомельскай вобласці на працягу многіх гадоў, з’ехаў з краіны ў адпаведнасці з пастановай аб дэпартацыі. Міхаіл Жукевіч, старшыня рады на пытаннях рэлігій і нацыянальнасцяў Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта, паведаміў, што пастанова стала вынікам выказванняў святара, апублікаваных у польскай газеце “Tygodnik wschodni”. Больш як 700 чалавек паставілі свае подпісы пад хадайніцтвам да ўладаў аб падаўжэнні тэрміну рэгістрацыі Худэка, але безвынікова.

Архібіскупу Йовану, прымасу Святой Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы (СБАПЦ) і актывісту кампаніі царкоўнай рэформы па-ранейшаму не дазвалялі наведаць краіну; урад не прызнае СБАПЦ.

Урад не дазваляе замежным місіянерам прымаць удзел у рэлігійнай дзейнасці па-за межамі ўстаноў, якія іх запрасілі. Перамяшчэнне паміж рэлігійнымі арганізацыямі, у тым ліку прыходамі, патрабуе папярэдняга атрымання дазволу ад дзяржавы.

Органы ўнутраных спраў могуць вымушаць замежных святароў з’ехаць з краіны, адмовіўшы ім у рэгістрацыі або не выдаўшы дазвол на часовае знаходжанне. Улады могуць дзейнічаць самастойна або на падставе рэкамендацый іншых урадавых устаноў.

Закон забараняе “падрыўную дзейнасць” замежных арганізацый і адкрыццё прадстаўніцтваў замежных арганізацый, дзейнасць якіх узбуджае “нацыянальную, рэлігійную і расавую варожасць” або можа “аказаць негатыўны ўплыў на фізічнае і духоўнае здароўе людзей”.

Замежных грамадзян, што афіцыйна знаходзяцца ў краіне з нерэлігійнымі мэтамі, могуць папярэдзіць ці дэпартаваць у выпадку іх ўдзелу ў рэлігійнай дзейнасці.

21 чэрвеня 2007 года ў Магілёве на падставе таго, што дакументы ўтрымлівалі тэхнічныя памылкі, суддзя адмяніла рашэнне па справе, па якой праходзілі сямёра грамадзян ЗША, і адправіла справу на новы разгляд. 13 лютага міліцыя абвінаваціла групу ў парушэнні, прадугледжаным Артыкулам 185 Адміністратыўнага кодэксу “Парушэнне парадку знаходжання замежных грамадзян у Беларусі” і аштрафавала кожнага на 15 даляраў (32 000 рублёў) за дзеянні, несумяшчальныя з умовамі атрыманых імі віз. 16 лютага 2007 года ўлады дэпартавалі гэтых семярых амерыканцаў і забаранілі ім уезд у краіну на два гады, прызнаўшы вінаватымі па двух асобных эпізодах незаконнай выкладчыцкай і незаконнай рэлігійнай дзейнасці. Паводле ўрада, гэтыя сямёра павінны былі атрымаць дазвол міністэрства адукацыі, каб выкладаць ангельскую мову ў малітоўным доме ў Магілёве. Па стане на зыход тэрміну, ахопленага гэтай справаздачай, паўторны судовы разгляд (відаць, завочны) яшчэ не адбыўся.

Закон не забараняе грамадзянам прапаведаваць і адкрыта казаць пра свае рэлігійныя перакананні, але на практыцы ўлады часта ўмешваліся ў іх дзейнасць, а таксама каралі

некаторых грамадзян, што прапаведавалі ад імя як зарэгістраваных, так і незарэгістраваных рэлігійных суполак. Улады рэгулявалі ўсе аспекты прапаведавання і распаўсюду літаратуры.

Сяргей Луканін, юрыст царквы “Новае жыццё”, накіраваў прэзідэнту Лукашэнку скаргу, па словах Луканіна, “на ўмяшальніцтва ўрада ў дзейнасць зарэгістраваных рэлігійных арганізацый”. Луканін спасылаўся на паведамленне пра тое, што ў траўні 2008 года Васіль Марчанка, кіраўнік аддзела па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта, даслаў лісты ў структуры аблвыканкама і ўпраўленне рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні, у якіх заклікаў да большай пільнасці ва ўзаемадзеяннях з прадстаўнікамі рэлігійных арганізацый, якія займаюцца місіянерскай дзейнасцю пад выглядам дабрачыннай”. Марчанка спасылаўся на дабрачынны канцэрт, арганізаваны царквой “Новае жыццё” 17 траўня ў нацыянальным дзіцячым анкалагічным цэнтры, што знаходзіцца ў вёсцы Бараўляны каля Мінска. Паводле Марчанкі, на канцэрце дзецям-гледачам раздалі падарункі і Біблії і расказалі пра цудоўнае выздараўленне з Божай дапамогай дзяўчынкі з Мінску, у якой быў рак позняй стадыі. У сваёй скарзе Луканін адзначыў, што канцэрт нельга расцэньваць як місіянерскую дзейнасць, таму што ні малітвы, ні абрады не праводзіліся ні да канцэрта, ні падчас яго, ні пасля. Па словах Луканіна, гэты выпадак “яшчэ раз прадэманстраваў, што дзейныя ў рэлігійнай сферы палажэнні, якія абмяжоўваюць поле дзейнасці цэркваў і забараняюць праводзіць рэлігійныя служэнні без дазволу, не адпавядаюць сучасным умовам і патрэбам грамадства”.

Улады па-ранейшаму пераследавалі і штрафавалі прыхільнікаў Харэ Крышна за незаконны распаўсюд рэлігійнай літаратуры.

Урад па-ранейшаму выкарыстоўваў падручнікі, што спрыяюць рэлігійнай нецярпімасці, асабліва ў адносінах да “нетрадыцыйных” рэлігійных суполак. Лідэры пратэстанцкай супольнасці крытыкавалі як дыскрымінацыйныя ў адносінах да пратэстантаў фармулёўкі падручніка “Асновы бяспекі жыццядзейнасці”, у прыватнасці, раздзел пад назвай “Беражыцеся сект”. Раздзел змяшчае параграф, які расказвае вучням пра такія “секты” як адвентысты сёмага дня, царква Марыі, Белае брацтва і Сведкі Іеговы. Міністэрства адукацыі, не зважаючы на пратэсты рэлігійных груп, па-ранейшаму выкарыстоўвала падручнік “Чалавек, грамадства, дзяржава”, у якім суполкі пратэстантаў і Харэ Крышна называюцца “сектамі”. Улады абяцалі змяніць фармулёўкі ў новых выданнях гэтых кніг. Ніводная з іх не была перавыдадзеная да канца перыяду, ахопленага гэтай справаздачай.

На абмежаваным узроўні адбывалася рэстытуцыя культавай уласнасці. Для рэстытуцыі ўласнасці, канфіскаванай падчас савецкага і нацысцкага перыядаў, не існуе заканадаўчай базы. Закон таксама абмяжоўвае рэстытуцыю ўласнасці, якая выкарыстоўваецца ў культурных і асветніцкіх мэтах. Урад не вяртаў будынкі, калі не меў месца для перасялення тых, што іх займае. Напрыклад, на працягу папярэдніх справаздачных перыядаў прыходзілі адмовы на бальшыню просьбаў яўрэйскай супольнасці вярнуць сінагогі, што выкарыстоўваюцца ў якасці тэатраў, музеяў, спартовых комплексаў і піўной. На працягу дадзенага справаздачнага перыяду яўрэйскія суполкі не падавалі заяваў на вяртанне дадатковых будынкаў ці іншай нерухомай маёмасці.

У жніўні 2007 года ўлады прыпынілі праект перабудовы былога кляштара бернардынаў, што ў Мінску. Напрыканцы папярэдняга справаздачнага перыяду Мінская каталіцкая парафія святога Юзафа праводзіла кампанію зваротаў да ўрада з просьбай вярнуць былы касцёл і будынкі кляштара, якія цяпер утрымліваюць дзяржаўныя архівы і якія плануецца ператварыць у гасцініцу і забаўляльны цэнтр. Суполка рэгулярна праводзіць блізу касцёла набажэнствы з таго часу, як упершыню даведалася пра планы рэканструкцыі ў 2004 годзе, але ў сакавіку 2007 года ўрад абвясціў пра новыя планы перабудовы, пасля чаго суполка пачала збор подпісаў пад петыцыяй, заклікаючы прэзідэнта Лукашэнку аддаць загад вярнуць будынкі. Па стане на канец справаздачнага перыяду лёс кляштара не быў вырашаны.

У лістападзе 2006 года мясцовыя ўлады ў Валожыне пагражалі адабраць у яўрэйскай суполкі правы на вернуты ёй будынак ешывы з-за таго, што не адбывалася яго аднаўленне. Яўрэйская суполка пачала аднаўленне ешывы, калі яе вярнулі ў 90-я гады, але для завяршэння рэстаўрацыі не хапіла фінансавання. Нарэшце ўлады не сталі канфіскоўваць 200-гадовы будынак пасля таго, як камітэт, што месціцца ў Злучаных Штатаў, паабяцаў у траўні 2007 года сабраць грошы на рэстаўрацыю. Па стане на канец справаздачнага перыяду дадатковай інфармацыі не было.

Замахі на свабоду веравызнання

На працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, урад па-ранейшаму рабіў замахі на свабоду веравызнання, скіраваныя супраць сябраў некалькіх рэлігійных груп. Як і раней, найчасцей рэлігійных лідэраў вінавацілі ў арганізацыі ці правядзенні несанкцыянаванага сходу, парушэнні, прадугледжаным законам, што абмяжоўвае свабоду сходаў. Закон дазваляе грамадзянам збірацца ў прыватных дамах, але ён абмяжоўвае правядзенне ў такіх месцах рытуалаў, абрадаў ці цырымоній і патрабуе папярэдняга атрымання дазволу ад мясцовых уладаў. На працягу справаздачнага перыяду пратэстанты і праваслаўныя суполкі, што не належаць да БПЦ, часта атрымлівалі штрафы ці папярэджанні за незаконную рэлігійную дзейнасць.

23 чэрвеня 2008 года баптысцкага пастара Уладзіміра Бурштына аштрафавалі на 330 долараў (700 000 рублёў) за арганізацыю харавых спеваў і правядзенне размовы на рэлігійныя тэмы каля рынку ва Ушачах.

29 красавіка 2008 года траіх асобаў, што падтрымлівалі кампанію збору подпісаў за ўнясенне зменаў у закон аб веравызнанні ад 2002 года, аштрафавалі на суму, роўную двухмесячнаму сярэдняму заробку.

19 красавіка 2008 года ў вёсцы Дражна Старадарожскага раёна прайшля памінальная служба, падчас якой быў устаноўлены крыж памяці вяскоўцаў, забітых пра-савецкімі партызанамі ў 1943 годзе. 23 красавіка ўлады выкапалі крыж, а аднаго з лідэраў грамадзянскай супольнасці Вечаслава Сіўчыка арыштавалі на 15 дзён за ўдзел у цырымоніі. Аўтар кнігі пра падзеі 1943 года знаходзіўся пад адміністратыўным арыштам у траўні. 17 чэрвеня Леаніда Акаловіча, праваслаўнага святара, які асвяціў крыж, аштрафавалі на 495 долараў (1 мільён рублёў).

30 сакавіка 2008 года Дзяніс Садоўскі, сакратар арганізацыйнага камітэта Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі, выступіў з крытыкай захадаў супраць 20 сябраў камітэта, адзін з якіх быў звольнены з Мазырскага педагагічнага ўніверсітэта, дзе ён працаваў электрыкам.  Іншых актывістаў партыі арыштавала міліцыя падчас дэманстрацыі ў Мінску 25 сакавіка.

10 сакавіка 2008 года пастара царквы "Новае жыццё" Вечаслава Ганчарэнку аштрафавалі на 165 долараў (350 000 рублёў) за тое, што ён не дазволіў інспектарам пажарнай службы зайсці ў будынак царквы. Паводле Ганчарэнкі, ён меў намер адмаўляць афіцыйным асобам у доступе да будынка да таго часу, пакуль Вярхоўны гаспадарчы суд не разгледзіць справу прымусовага продажу царкоўнай уласнасці; справа была адкладзеная на нявызначаны тэрмін у сакавіку 2007 года. Царква "Новае жыццё" сутыкнулася з пагрозай  закрыцця, таму што ўлады адмовіліся рэгістраваць яе па адрасе кароўніка, які знаходзіўся ва ўласнасці царквы і які яна мела намер выкарыстоўваць як памяшканне для набажэнстваў. Ва ўмовах адсутнасці рэгістрацыі любая дзейнасць царквы лічылася нелегальнай. На знак пратэсту супраць загаду Мінскага гарадскога гаспадарчага суда ад 10 ліпеня 2006 года прадаць царкоўны будынак гораду за суму, значна ніжэйшую за яго рынкавы кошт, і вызваліць памяшканне да 8 кастрычніка 2006 года, прыхажане царквы "Новае жыццё" і тыя, хто ім спачувае, пачалі 23-дзённую галадоўку, якая прымусіла ўлады перагледзець сваё рашэнне.

10 сакавіка 2008 года ў Жодзіна пастар прыхода пратэстанцкай царквы "Святой Троіцы" абскардзіў штраф у памеры 82 долараў (175 000 рублёў), накладзены на яго Жодзінскім гарадскім судом за арганізацыю "несанкцыянаванага масавага мерапрыемства", калі яго царква наладзіла канцэрт і набажэнства ў мясцовым кінатэатры 24 студзеня. Набажэнства, у якім прынялі удзел каля 300 чалавек, было спыненае, калі ідэалагічныя работнікі ўвайшлі ў залю і загадалі міліцыянерам, што іх суправаджалі, забяспечыць спыненне сходу.

29 лютага 2008 года ў Мазыры Гомельскай вобласці ўлады папярэдзілі Царкву Ісуса Хрыста, што яе малітоўны дом не павінны выкарыстоўвацца для мэтаў, якія б адрозніваліся ад абвешчанай. Прыход абвінавацілі ў правядзенні "палітычнай агітацыі" ў сваіх памяшканнях.

30 студзеня 2008 года "Новае пакаленне", пратэстанцкі прыход у Баранавіцкім раёне, аштрафавалі на 330 долараў (700 000 рублёў) за правядзенне набажэнства на арэндаваным участку ў парушэнне дамовы арэнды.

28 кастрычніка 2007 года баптысцкі прыход у Гродна, які ўзначальвае пастар Юры Краўчук, наведала міліцыя падчас набажэнства з нагоды свята ўраджаю; 21 снежня прыход аштрафавалі на 64 долары (140 000 рублёў) за "незарэгістраваную рэлігійную дзейнасць".

18 снежня 2007 года ў Мінску ўлады вынеслі папярэджанне пратэстанцкай "Царквы Бога". Суполка звярнулася да Мінскіх гарадскіх уладаў па ўчастак зямлі для будаўніцтва царквы,

і ў выніку ўлады правялі праверку дзейнасці царквы. Яны абвясцілі пра парушэнні парадку падачы дакументаў і адсутнасць шыльды з назвай прыхода на будынку, дзе ён меў юрыдычны адрас. Па стане на канец справаздачнага перыяду царква не атрымала ўчастак, але па-ранейшаму праводзіла набажэнствы. Пастар Генадзь Кернажыцкі звязаў рашэнне з моцнай падтрымкай прыходам царквы “Новае жыццё” ў яе супрацьстаянні з уладамі ў справе ўласнасці на зямлю.

14 снежня  2007 года ў горадзе Баранавічы на захадзе краіны траіх сябраў Рады баптысцкіх цэркваў аштрафавалі на агульную суму 386 долараў (840 000 рублёў), роўную сярэдняму заробку за два месяцы. Пастара Змітра Асуку  аштрафавалі за арганізацыю дзейнасці незарэгістраванай рэлігійнай арганізацыі ў прыватным доме. Кожнага з дваіх уладальнікаў дома, Сцяпана Парыпу і Мікалая Пестака, аштрафавалі на суму, што перавышала сярэдні заробак за адзін месяц. Прыход адмовіўся праходзіць рэгістрацыю, і службовыя асобы завіталі на набажэнства, каб абвясціць яго незаконным.

26 кастрычніка 2007 года ва ўсходняй Магілёўскай вобласці пастара прыхода Асіповічскай рады цэркваў Генадзя Рыжкова аштрафавалі на 115 долараў (248 000 рублёў) за правядзенне набажэнства з нагоды свята ўраджаю ў прыватным двары.

12 кастрычніка 2007 года прэзідэнт Лукашэнка выступіў з надзвычай зневажальнымі антысеміцкімі выказваннямі ў гутарцы з рэгіянальнымі расейскімі журналістамі, абвясціўшы, што яўрэйскае насельніцтва ператварыла Бабруйск, горад з 226 тысячамі жыхароў у Магілёўскай вобласці, у “свінушнік”. “Калі вы былі ў Бабруйску, вы бачылі, ў якім стане быў горад”, сказаў ён. “Страшна было зайсці! Свінушнік быў! Гэты быў пераважна яўрэйскі горад. Вы ведаеце, як яўрэі ставяцца за месца, дзе жывуць. Паглядзіце на Ізраіль, я там быў”, сказаў ён. Ён таксама заклікаў яўрэяў “з грашыма” вярнуцца жыць ў горад.

10 кастрычніка 2007 года пракурор Савецкага раёна Гомеля вынес афіцыйнае папярэджанне пастару Змітру Падлобку царквы “Жывое слова”, што мае 100 прыхажан, за правядзенне нядзельнага набажэнства ў прыватным памяшканні без атрымання дзяржаўнай рэгістрацыі, што ёсць парушэннем жыллёвага кодэкса. Службовец папярэдзіў Падлобку, што ў выпадку паўторнага парушэння ён можа быць прыцягнуты да адказнасці.

30 верасня 2007 года ў Гомелі лідэра харызматычнай царквы папярэдзілі аб неабходнасці спынення “незаконных дзеянняў” пасля таго, як прыхажане правялі набажэнства ў прыватных памяшканнях.

23 верасня 2007 года ў горадзе Жодзіна службовыя асобы ўвайшлі ў памяшканні Святатроіцкай Царквы Хрысціян Веры Евангельнскай. Мясцовыя ўлады не далі дазволу на правядзенне ў будынку набажэнстваў. Службовыя асобы прыйшлі з праверкай падчас набажэнства, і былі абвінавачаныя ў зневажальных выказваннях, спробах рабіць фотаздымкі і аўдыёзапіс малітваў, а таксама пагрозах зрабіць захады супраць прыхода.

24 жніўня 2007 года службовая асоба падтрымала налажэнне штрафа ў памеры 330 долараў (700 000 рублёў) на баптысцкага пастара Віктара Арэхава за арганізацыю

царкоўнага летніка, які, па меркаванні службовай асобы, быў парушэннем закона, што забараняе стварэнне і кіраванне дзейнасцю рэлігійнай арганізацыі без дзяржаўнай рэгістрацыі. Баптыстам у паўднёва-ўсходняй Брэсцкай вобласці адмовілі ў арэндзе памяшканняў рэкрэацыйных устаноў, якія яны выкарыстоўвалі ў папярэдніх гадах. Калі ў чэрвені яны арганізавалі летнік на тэрыторыі, што знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, міліцыя прыйшла з праверкай, каб апытать дзяцей, і пагражала закрыць летнік прымусова.

11 ліпеня 2007 года прыход Царквы Ісуса Хрыста і яго пастар Барыс Чарнаглаз паспяхова прадухілі закрыццё штогодняга прыхадскога сямейнага летніка ў Валожынскім раёне. 10 ліпеня Валожынскі ідэолаг Ігар Бобрык зрабіў спробу закрыць летнік, патрабуючы, каб намёты былі звёрнутыя і яму быў пададзены спіс больш як 150 прыхажан-удзельнікаў летніка. Бобрык прадаставіў афіцыйны ліст, які патрабаваў, каб летнік быў закрыты з прычыны адсутнасці дакументаў, што дазвалялі б яго дзейнасць. Чарнаглаз звярнуўся да Мінскіх абласных уладаў і здолеў давесці, што ў прыхода быў афіцыйны дазвол і ўсе неабходныя дакументы для адкрыцця летніка. Прыход ладзіў летнік на гэтым месцы на працягу 11 гадоў і ніколі раней не сутыкаўся са складанасцямі ў адносінах з уладамі.

Паведамлялася, што 5 ліпеня 2007 года міліцыя затрымала 19 асобаў, што збіралі подпісы пад заклікам да ўнясення зменаў у закон аб веравызнанні ад 2002 года. Яшчэ 14 зборшчыкаў подпісаў былі затрыманыя 2 ліпеня ў Будславе Мядзельскага раёна Мінскай вобласці.

У адрозненне ад папярэдніх справаздачных перыядаў, на працягу апошняга дзяржаўныя выданні не рабілі захадаў супраць іудзейскіх суполак, аднак працягваўся продаж і распаўсюд антысеміцкай літаратуры праз дзяржаўных распаўсюднікаў прэсы, урадавыя ўстановы і крамы, звязаныя з БПЦ. Праз “Праваслаўную кнігу”, што прадае праваслаўную літаратуру і рэлігійную атрыбутыку, па-ранейшаму прадавалі антысеміцкія і рускія ультранацыяналістычныя газеты і літаратуру, DVD і відэакасеты. “Праваслаўная кніга” -- частка фірмы “Хрысціянская ініцыятыва”, чый генеральны дырэктар часта пісаў ксенафобскія артыкулы. У “Праваслаўнай кнізе” можна было набыць некалькі іншых антысеміцкіх выданняў, у тым ліку “Міфы і праўда пра пагромы” і “Тайны пратаколаў сіёнскіх мудрацоў: змова супраць Расіі” Алега Платонава, у якіх сцвярджаецца, што іудаізм ёсць варожым у адносінах да рускай цывілізацыі і што пагромы пачатку 20 стагоддзя былі сіяніцкай правакацыяй, і што яўрэі забілі расійскіх уладароў і развязалі тэрор у савецкія часы.

Пра зняволенні ці затрыманні па рэгілійных матывах паведамленняў не паступала.

Прымусовы зварот у веру

Не паступала паведамленняў ні пра прымусовы зварот у веру, ні пра непаўналетніх грамадзян ЗША, якія былі б выкрадзеныя або незаконна вывезеныя са Злучаных Штатаў, ні пра адмову прадаставіць магчымасць такім грамадзянам вярнуцца ў Злучаныя Штаты.

Паляпшэнне і станоўчыя змены ў сітуацыі з захаваннем свабоды веравызнання

На працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, адбыліся некаторыя станоўчыя змены ў сітуацыі з захаваннем свабоды веравызнання.

29 красавіка 2008 года чалавечыя парэшткі са старых яўрэйскіх могілак, знойдзеныя падчас земляных прац каля стадыёна ў Гомелі, былі перазахаваныя на іншых мясцовых яўрэйскіх могілках. З Ізраіля для правядзення цырымоніі прыяжджаў равін. Прадстаўнікі мясцовых уладаў прысутнічалі на цырымоніі і садзейнічалі перазахаванню.

28-30 красавіка 2008 года ў Мінску прайшла міжнародная канферэнцыя, прысвечаная беларуска-яўрэйскаму дыялогу. Эксперты з Беларусі, Ізраіля, Расіі і Украіны прынялі ўдзел у канферэнцыі, якую арганізаваў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт з дапамогай амбасады Ізраілю і некалькіх яўрэйскіх арганізацый.

5 кастрычніка 2007 года ў Гомелі адкрыўся новы малітоўны дом царквы адвентыстаў сёмага дня. Прыход не канфліктаваў з уладамі ці мясцовымі жыхарамі, але на вырашэнне ўсіх юрыдычных і тэхнічных пытанняў з урадавымі ўстановалі спатрэбілася больш як 6 месяцаў.

З 18 па 22 чэрвеня 2008 года Мінск наведаў Дзяржаўны сакратар Ватыкана кардынал Бэртонэ. Бэртонэ сустрэўся з прэзідэнтам Лукашэнкам, мітрапалітам Філарэтам, міністрам замежных спраў Мартынавым і Леанідам Гулякам, упаўнаважаным на справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Бэртонэ наведаў Пінск і Гродна. У Мінску ён правёў набажэнства ў касцёле святых Сымона і Алены і цэлебраваў імшу ў Архікатэдральным касцёле Найсвяцейшай Паны Марыі. Кардынал асвяціў вуглавы камень касцёла Яна Хрысціцеля, які стане першым каталіцкім касцёлам, пабудаваным у горадзе ад 1910 года.
.
У чэрвені 2008 года Беларуская грэка-каталіцкая царква (ўніяцкая царква) адкрыла ў Мінску рэлігійны цэнтр. Трохпавярховы будынак Грэка-каталіцкага цэнтра Святога Юзафа складаецца з капліцы, бібліятэкі ды інш. Паводле паведамленняў, у цэнтры ёсць нядзельная школа, праходзяць кінапаказы, ажыццяўляюцца дабрачынныя праграмы.

Частка 3. Знявага і дыскрымінацыя ў грамадстве

Некаторыя прадстаўнікі грамадства імкнуліся садзейнічаць свабодзе веравызнання, аднак у грамадстве былі адзначаныя выпадкі знявагі і дыскрымінацыі па рэлігійных перакананнях, па-ранейшаму прысутнічалі антысемітызм і негатыўнае стаўленне да суполак, што належаць да рэлігійных меншасцяў.

Улады церпліва ставяцца да антысемітызму. Расследаванні вяліся неэфектыўна і толькі па фактах некаторых антысеміцкіх захадаў. Прысутнічалі праявы дзейнасці неанацыстаў, аднак звычайна ўлады кваліфікавалі іх як хуліганства.

27 траўня 2008 года ў Віцебску рэдактар апазіцыйнай газеты атрымаў ліст з пагрозамі ад сябраў неанацысцкай арганізацыі “Российское национальное единство”(РНЕ).

1 траўня 2008 года ў Баранавічах зневажальныя надпісы і сімвалы былі нанесеныя на будынак царквы “Новае пакаленне”. Паводле слоў пастара царквы, гэта быў трэці выпадак вандалізму за некалькі месяцаў. Прадстаўнікі ідэалагічнага аддзелу наведалі царкву, але не сталі праводзіць разбіральніцтва.

27 красавіка 2008 года, у ноч на праваслаўны Вялікдзень на закрытых могілках у Рагачове Гомельскай вобласці былі пашкоджаныя 37 магіл. Былі пашкоджаныя 16 крыжоў і 3 надмагільныя камяні; яшчэ 18 крыжоў былі паваленыя і раскіданыя. Міліцыя распачала крымінальную справу па фактах гэтага інцыдэнту.

Некалькі яўрэйскіх культавых месцаў пацярпелі ад вандалізму цягам справаздачнага перыяду.

23 траўня 2008 года антысеміцкія надпісы былі знойдзеныя будынках сінагогі і яўрэйскага абшчыннага цэнтра ў горадзе Барысаве, што на поўдзень ад Мінску на адлегласці прыкладна 35 міль. Па стане на канец справаздачнага перыяду падазраваныя асобы вызначаныя не былі.

21 красавіка 2008 года вандалы пашкодзілі мемарыял ахвярам Халакоста ў Слуцку Мінскай вобласці. Нявызначаныя асобы залілі карычневай фарбай агароджу вакол мемарыяла, нанеслі на мемарыял з дапамогай трафарэта 15 свастык і (памылковую) дату нараджэння Адольфа Гітлера. Паводле паведамленняў, у папярэднім годзе вандалы зрабілі захады супраць офіса яўрэйскай суполкі, намаляваўшы на будынку свастыкі і пакінуўшы антысеміцкія надпісы.

29 лютага 2008 года судзілі маладога чалавека, схопленага падчас нанясення спрэй-фарбай свастык на банкамат, плот і будынак. Яго прызналі вінаватым і прыгаварылі да пазбаўлення волі ўмоўна.

11 лютага 2008 года вандалы падпалілі вянкі і кветкі, ускладзеныя да мемарыялу ахвярам Халакоста ў Брэсце. З часу адкрыцця ў 1992 годзе мемарыял быў апаганены шмат разоў. 9 траўня 2007 года вандалы падпалілі кветкі, ускладзеныя да помніка. Міліцыя распачала крымінальную справу, але не вызначыла падазраваных. У лютым 2007 года вандалы апаганілі помнік, аднак падазраваныя вызначаныя не былі. У лістападзе 2006 года на месцы таго самага помніка адбыўся выбух, які міліцыя кваліфікавала як дробнае хуліганства.

У снежні 2007 года чацвярых прыхільнікаў сатанінскай групоўкі “Крывавы месяц”, што па стане на канец папярэдняга справаздачнага перыяду знаходзіліся на следствам, судзілі за падпал дзвюх цэркваў – спальванне праваслаўнай царквы Святога Георгія ў снежні 2006 года і спробу падпалу рымска-каталіцкага касцёла 18 стагоддзя ў Мазыры ў сакавіку 2007 года. На вонкавыя сцены абодвух храмаў былі нанесеныя сатанінскія надпісы.

23 кастрычніка 2007 года вандалы запэцкалі чорнай фарбай і намалявалі свастыкі на некалькіх надмагільных камянях Аршанскіх могілак.

12 кастрычніка 2007 года, у той жа дзень калі прэзідэнт Лукашэнка выступіў па нацыянальным радыё з надзвычай зневажальнымі антысеміцкімі выказваннямі пра Бабруйск, вандалы разбілі 15 надмагілляў і пакінулі чалавечыя экскрэменты на гарадскіх яўрэйскіх могілках.

15 жніўня 2007 года чацвёра сябраў Кансерватыўнай хрысціянскай партыі атрымалі лісты з пагрозамі, падпісаныя мясцовым аддзяленнем «Русского национального единства» (РНЕ), расійскай ультранацыяналістычнай групоўкі, якая працягвала сваё існаванне, нягледзячы на тое, што была афіцыйна распушчаная ў 2000 годзе. Улады адмовіліся распачынаць крымінальную справу. У лістападзе 2007 года сына аднаго з сябраў збілі на вуліцы ў Віцебску. У збіцці падазравалі актывістаў РНЕ.

Яўрэйская супольнасць па-ранейшаму выказвала занепакоенасць выкарыстаннем панятку “больш шчыльнага славянскага саюза”, які карыстаецца папулярнасцю сярод нацыяналістычных арганізацый, што дзейнічаюць у краіне, у тым ліку ў «Русского национального единства» (РНЕ). Лідэры яўрэйскай супольнасці заклікалі ўлады да расследавання неанацысцкіх захадаў, прыводзілі ўсё новыя прыклады вандалізму, антысеміцкіх надпісаў і пагрозаў на адрас грамадзянскай супольнасці і рэгілійных суполак. У параўнанні з папярэднімі справаздачнымі перыядамі быў заўважаны некаторы рух наперад.

Паводле прэс-офіса Гомельскага КДБ, у ліпені 2007 года аднаго з лідэраў Гомельскага адзялення РНЕ Міхаіла Якаўчука абвінавацілі ў дзеянні ад імя незарэгістраванай арганізацыі і прыгаварылі да 6-месячнага арышту. Справа была распачатая ў 2006 годзе, калі Якаўчук атрымаў афіцыйнае папярэджанне, але не спыніў сваёй дзейнасці, працягваючы выдаваць і распаўсюджваць агітацыйныя матэрыялы і імкнучыся знайсці прыхільнікаў для сваёй арганізацыі. Супраць яшчэ аднаго прыхільніка РНЕ было высунутае абвінавачанне, але ён уцёк і хаваецца ад следства.

На афіцыйным сайце БПЦ Гаўрыіл Беластоцкі, малалетняе дзіцё, нібыта забітае яўрэямі каля Гродна ў 1690 годзе, узгадваецца як святы і пакутнік. Памінальная малітва, што чытаецца ва ўгодкі яго смерці, узгадвае “мужнага пакутніка” Гаўрыіла, які “выкрыў нячэснасць яўрэяў”.

Частка 4. Палітыка ўрада ЗША

Урад ЗША абмяркоўвае пытанні свабоды веравызнання з урадам ў межах сваёй агульнай палітыкі па абароне правоў чалавека.

Супрацоўнікі амбасады падтрымлівалі сувязі з прадстаўнікамі рэлігійных груп, сустракаліся для абмеркавання пытанняў свабоды веравызнання ў краіне з грамадзянамі ЗША рознага веравызнання, якія жылі ў Беларусі або наведвалі яе. Супрацоўнікі амбасады наведалі некалькі імпрэзаў, што праводзіліся рэлігійнымі групамі, у тым ліку цырымоніі адкрыцця культавых помнікаў, а таксама семінар, прысвечаны ўнясенню зменаў у закон аб веравызнанні ад 2002 года. Амбасада дэманстравала падтрымку свабоды веравызнання праз наведванне судоў над прадстаўнікамі рэлігійных груп, што цярпелі ад пераследу па

рэлігійных матывах. Урад Злучаных Штатаў выступаў з асуджэннем выпадкаў антысемітызму і рабіў захады, каб прадухіліць такія выпадкі, у тым ліку праз пастаяннае адсочванне паведамленняў пра выпадкі апаганьвання яўрэйскіх мемарыялаў і могілак. Амбасада сачыла за працягам продажу антысеміцкай і ксенафобскай літаратуры ў крамах і падчас імпрэзаў, звязаных з БПЦ, а таксама праз дзяржаўную сетку распаўсюду друкаваных выданняў. Супрацоўнікі амбасады стала ўключалі наведванне культавых месцаў у праграму сваіх вандровак па краіне.

Супрацоўнікі амбасады абмяркоўвалі пытанні свабоды веравызнання з прадстаўнікамі іншых замежных дыпламатычных місій, каб дэманстраваць салідарнасць у падтрымцы свабоды веразвызнання.